**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за ліпень 2024 г.

### Мерапрыемствы, прысвечаныя 80-годдзю вызвалення Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

***4 ліпеня. Кобрын***

*У бібліятэцы прайшоў гістарычны ўрок "Беларусь: вызваленне, памяць, незалежнасць". Дзеці чыталі вершы пра Радзіму. Ушанавалі памяць загінуўшых землякоў і ўсклалі кветкі ў помніка.*

*Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 23 чал.*

***11 ліпеня. Кобрын***

*Бібліятэка арганізавала для дзяцей ўрок мужнасці "Мае продкі –героі вайны". Прадстаўлена кніжная выстава "Дзецям аб вайне". Дзеці пазнаёміліся з ветэранамі, якія жылі ў вёсках Кіселявецкага сельскага савета.*

*Магдалінская ПБ, 19 чал.*

***5 ліпеня. Кобрын***

*У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры бібліятэкі прайшла вечарына "Во славу Кобрина родного!", прысвечаная святкаванню 80-годдзя вызвалення г.Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 737-годдзя г. Кобрына пры ўдзеле намесніка старшыні Кобрынскага РВК Ганны Брынчук. Чытачы бібліятэкі, падапечныя аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў і дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН і Кобрынскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната сталі гасцямі свята. Адбылася прэзентацыя кнігі "Гэта наша памяць" члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўніка клуба "ПаэтыКо" Наталлі Ніжнік (Кандрашук).*

*ЦБ, 49 чал.*

***24 ліпеня. Кобрын***

*У бібліятэцы прайшла гульня-віктарына «Мая чароўная Беларусь» для жыхароў сяла. Адбылася прэзентацыя кніжнай выставы "Мінулых дзён святая памяць" і ўзнагароджванне лепшых знатакоў гісторыі Кобрына.*

*Батчынская ПБ, 18 чал.*

### Мерапрыемствы, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь

***2 ліпеня. Кобрын***

*У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры бібліятэкі прайшоў гістарычны час «Ішоў мой край дарогамі вайны», прымеркаваны да Дня Незалежнасці*

*Рэспубліці Беларусь.Вядучыя расказалі навучэнцам Кобрынскага ДПТК аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны, аб подзвігах абаронцаў Брэсцкай крэпасці, аб ходзе Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі "Баграціён".*

*ЦРБ, 26 чал.*

***4 ліпеня. Кобрын***

*Бібліятэкар арганізавала гадзіну інфармацыі «Страницы памяти», у ходзе якой былі прадстаўлены: тэматычная відэа-прызэнтацыя "Беларусь: гісторыя вайны", агляд патрыятычнай літаратуры "Беларусь неперможная" ў кніжнай выставы "Заўжды квітней пад мірным небам, Беларусь!".*

*Хідрынскай ПБ, 19 чал.*

## Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу на лепшую пастаноўку работы з дзецьмі і падлеткамі ў канікулярны час у рамках сацыя-культурнага праекта «Объединить, заинтересовать, увлечь»

***11 ліпеня. Кобрын***

*У бібліятэцы адбылася пазнавальная гульня «Куфар сямейных скарбаў». Дзеці з задавальненнем адгадвалі загадкі, успаміналі прыказкі аб сям'і, удзельнічалі ў конкурсах "Прыказкі аб сям'і", "Сям'я ў казках", "Міфы аб сям'і", "Загадка са словам "сям'я".*

*Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 17 чал.*

***17 ліпеня. Кобрын***

*Бібліятэкар правяла літаратурную гульню "С книгой по лету"для навучэнцаў Хідрынскай СШ. Для дзяцей праводзілася літаратурная віктарына, конкурсы загадак і адгадак, знаёмства-агляд дзіцячай літаратуры "Навінкі друку.*

*Хідрынскай ПБ, 16 чал*

***18 ліпеня. Кобрын***

*Бібліятэкар правяла пазнавальную гульню "Почитаем, поиграем, отдохнем, лето с пользой проведем". Наведвальнікі ўдзельнічалі ў конкурсах: "Крыжаванка", "Загадкі пра жывел", "Хто кім быў","Калі гэта бывае". Была афармлена выстава "Цудоўны свет перыедыкі".*

Кіселявецкая ПБ, *18 чал.*

***24 ліпеня. Кобрын***

*Бібліятэкар правяла квэст-гульню "Следопыты". Каб дабрацца да скарбаў, удзельнікам гульні неабходна было сабраць пазлы, адгадаць рэбусы, зашыфраваныя словы, крыжаванкі, праспяваць песню, растлумачыць дзеянні чалавека і нават сабраць трох насякомых.*

*Гарадзецкая ПБ, 20 чал.*

<u>**Іншыя мерапрыемствы**</u>

***16 ліпеня Кобрын***

*У Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбылася святочная вечарына “Дорога длиною в 100 лет”, прысвечаная 100-годдзю з дня заснавання грамадскага аб'яднання “Беларускае таварыства інвалідаў па зроку”. З прывітальным словам да прысутных звярнуўся старшыня Брэсцкай абласной арганізацыі ГА “БелТІЗ” Ірына Юрэня. У цырымоніі ўзнагароджання членаў ГА "БелТІЗ" прымал ўдзел старшыня Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Майсяюк.*

*ЦБ, 48 чал.*

Выканаўца Галавацкая Т.А.
тэл. 3 85 81